УДК [069.1:069.5]:(=161.3)

**Т. У. Міранові́ч,**
*вядучы навуковы супрацоўнік экспазіцыйнага аддзела дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ПРАКТЫКІ ЗАХАВАННЯ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ЭКСПАЗІЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Анатацыя.** *Разглядаецца беларуская мова як аб'ект нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Закранаецца спецыфіка актуальнай моўнай сітуацыі ў Беларусі. Падкрэсліваецца роля беларускай мовы ў музейнай дзейнасці. Падаецца характарыстыка практык выкарыстання беларускай мовы ў экспазіцыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь з мэтай яе захавання і папулярызацыі. Апісваюцца сродкі і прыёмы, якія ўжываюцца ў музейнай рабоце.*

**Ключавыя словы:** *беларуская мова, музей, экспазіцыя, практыка захавання, Нацыянальны гістарычны музей, папулярызацыя.*

**T. Miranovich,**
*leading researcher of the exposition department of the State Institution "National Historical Museum of the Republic of Belarus", Minsk, Republic of Belarus*

# PRACTICES OF PRESERVATION AND PROMOTION OF THE BELARUSIAN LANGUAGE IN THE EXHIBITION ACTIVITIES OF THE NATIONAL HISTORICAL MUSEUM OF THE REPUBLIC OF BELARUS

**Abstract.** *The Belarusian language is considered as an object of intangible cultural heritage of the Republic of Belarus. The author concerns specifics of the current language situation in Belarus; emphasizes the role of the Belarusian language in museum activity. The author presents the description of the practices of using the Belarusian language in the exhibition activities of the National Historical Museum of the Republic of Belarus, with the aim of its preservation and popularization. The article describes the means and methods used in museum work.*

**Key words:** *belarusian language, museum, exposition, preservation practice, National historical museum, popularization.*

Нематэрыяльная культурная спадчына – гэта звычаі, традыцыі, абрады, фальклор, беларуская мова, веды і навыкі, іншыя праяўленні

творчасці чалавека [4, с. 50]. Менавіта на беларускай мове як носьбіце нематэрыяльнай культурнай спадчыны засяродзім увагу.

Кожны народ – гэта непаўторная культура, гісторыя, традыцыі, лад жыцця, мова. Гісторыя беларускага пісьменства налічвае не менш за дзесяць стагоддзяў. Мова ствараецца і ўдасканальваецца грамадствам і з'яўляецца захавальніцай тысячагадовага досведу народа. Родная мова накладвае ўнікальны адбітак на носьбіта з моманту нараджэння. Яна з'яўляецца інструментам зносін, разважання і ўспрымання, адлюстроўвае сувязь паміж мінулым, сучаснасцю і будучыняй. Мова фарміруе і насычае свядомасць закладзенымі ў ёй традыцыямі і культурай. Зберагчы моўную базу вялікага народа і малой народнасці – вельмі важная задача. Сёння ў свеце існуе каля 6 тыс. моў і 43 працэнты з іх знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Толькі некалькі соцень моў іграюць значную ролю ў сістэмах адукацыі і ў дзяржаўнай сферы, менш за сто з іх выкарыстоўваюцца ў свеце лічбавых тэхналогій.

На пасяджэнні-нарадзе з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі (25.02.2022) Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка выступіў за развіццё ў грамадстве беларускай мовы: «Тое, што нас адрознівае ад іншых – гэта ёсць беларуская мова. Нам не трэба ад гэтага адыходзіць. Нам трэба падумаць аб тым, каб кожны беларус яе ведаў. <…> Нельга забываць сваю мову» [2].

Па выніках перапісу насельніцтва 2019 г. 61,2% беларусаў прызнаюць беларускую мову роднай. У агульнай колькасці беларускую мову пазначылі роднай 5 094 928 жыхароў рэспублікі, а дома на ёй размаўляюць 2 447 764 чалавекі. Рускую мову лічаць роднай 3 983 765 жыхароў краіны, а дома на ёй размаўляюць 6 718 557. Такая інфармацыя змяшчаецца ў бюлетэні, апублікаваным на сайце Белстата [1].

У XXI ст. беларуская мова як высокаразвітая літаратурная мова паспяхова абслугоўвае ўсе сферы зносін сучаснага беларускага грамадства. Гэта нацыянальная мова беларусаў, мова тытульнай нацыі і дзяржаўная мова краіны. Яна валодае багатым слоўнікавым складам, распрацаванай навуковай тэрміналогіяй, устойлівай пісьмовай традыцыяй і развіваецца ў адпаведнасці з агульнымі тэндэнцыямі моўнага развіцця ў свеце. Па колькасці носьбітаў адносіцца да найбольш распаўсюджаных моў свету [5, с. 554]. Беларуская мова сёння з'яўляецца найважнейшым кампанентам сучаснай моўнай сітуацыі ў Беларусі, а таксама займае вызначанае месца ў моўных сітуацыях іншых краін. Напрыклад, нацыянальная беларуская мова мае статус дзяржаўнай мовы ў Беларусі, рэгіянальнай мовы ў Польшчы, мовы нацыянальнай меншасці ва Украіне і Чэхіі. У Рэспубліцы Беларусь устаноўлена дзяржаўнае двухмоўе – статус афіцыйнай выконваюць беларуская і руская мовы. Беларускім заканадаўствам канстытуцыйна замацаваны статус дзвюх найбольш распаўсюджаных у сучаснай камунікатыўнай

прасторы краіны блізкароднасных славянскіх моў. Між тым месца і роля беларускай мовы як рэальнага сродку камунікацыі ў сучасным беларускім грамадстве вельмі неадназначныя, што абумоўлена не толькі асаблівасцямі існуючай моўнай сітуацыі, але і гістарычнымі шляхамі яе фарміравання [6, с. 191].

Місія музея як сацыяльнага інстытута – захоўваць і папулярызаваць матэрыяльную і нематэрыяльную культурную спадчыну, нацыянальную культурную традыцыю [4, с. 137], рэалізоўваць захады па прасоўванні і ўжыванні беларускай мовы.

*Мэтай* даследавання з'яўляецца аналіз практык Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, накіраваных на захаванне і папулярызацыю беларускай мовы.

Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь з'яўляецца адной з вядучых культурных арганізацый краіны, якая займаецца папулярызацыяй выкарыстання беларускай мовы ў жыцці грамадства. У яго зборы знаходзіцца самая шматлікая музейная калекцыя ў Беларусі. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь згодна са сваёй кампетэнцыяй рэалізуе такія напрамкі дзейнасці, як падрыхтоўка бланкаў загадаў і карэспандэнцый на беларускай мове; арганізацыя анонсаў навін і іншых інфармацыйных матэрыялаў на беларускай мове; ажыццяўленне мерапрыемстваў, прысвечаных Дню беларускага пісьменства; выпуск рэкламнай прадукцыі на беларускай мове (календароў, паштовак, лістовак); пашырэнне выкарыстання беларускай мовы ў навуковай друкаванай прадукцыі: каталогах, кампакт-дысках, віртуальных выстаўках, выданні рэспубліканскага часопіса «Беларускі музей» і г. д.; выкарыстанне беларускай мовы ў навукова-дапаможных матэрыялах, у т. л. анатацыях, этыкетажы выставак, што праходзілі ў музеі, сталай экспазіцыі, у мультымедыйных комплексах часовых экспазіцый.

*У 2020 г. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь далучыўся да міжнароднага святкавання Дня роднай мовы.* Міжнародны дзень роднай мовы (International Mother Language Day) адзначаецца штогод 21 лютага ў адпаведнасці з рашэннем ЮНЕСКА 1999 г. і накіраваны на заахвочванне моўнай разнастайнасці, папулярызацыю і захаванне моўных і культурных традыцый.

*З гэтай нагоды 21 лютага 2020 г. у музеі праведзены шэраг мерапрыемстваў:* лекцыя дацэнта кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ Ларысы Гедымін «Уводзіны ў беларускую мову і арфаграфію ад У да Ў»; кураторская экскурсія па выстаўцы «Ян Камар. Фатограф з Нянькава» ад Надзеі Саўчанка і Альберта Цэхановіча; сустрэча з Раманам Арловым (музычны гурт «У нескладовае»). У холе музея рэалізавана інтэрактыўная гульня «Любімае беларускае слова» – удзельнікам прапанавалася на адмысловым плакаце ўзгадаць і напісаць любімыя словы на роднай мове.

На працягу 2021–2022 гг. гэтыя традыцыі атрымалі працяг – у музеі прайшлі сустрэчы, прымеркаваныя да Міжнароднага дня роднай мовы. У лютым 2021 г. у межах выставачнага праекта «Беларусь і беларусы» была арганізавана выстаўка «Моўны код» (працавала 23 дні). На выстаўцы былі прадстаўлены графічныя работы Уладзіміра Басалыгі з серыі «Мова наша родная» (1980–1990-я гг.), творы сучаснай мастачкі Томы Пракоф'евай «Беларускі алфавіт». Наведвальнікі музея азнаёміліся з асобнымі фактамі з гісторыі беларускай мовы: экспанатамі са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, якія змяшчаюць археалагічныя матэрыялы Мінска, Полацка, Браслаўскага рэгіёна, дакументы Усевалада Ігнатоўскага, перыядычныя выданні.

Асобным блокам былі пададзены інтэрактыўныя элементы: наведвальнікам прапанавалася на дошцы крэйдай напісаць любімае беларускае слова. «Гульня ў словы» патрабавала ад удзельнікаў уважлівасці. Яны павінны былі на дошцы знайсці малавядомыя беларускія словы, якія сустракаюцца на графічных работах мастакоў у экспазіцыі, адгадаць іх значэнне. На адваротным баку карткі знаходзілася тлумачэнне гэтых слоў з перакладам на рускую, англійскую мовы.

У гульні «Знайдзі верш» на 9 кубіках на кожнай з граней напісаны радкі вядомых вершаў беларускіх класікаў: Максіма Багдановіча, Якуба Коласа, Янкі Купалы, Петруся Броўкі і 2 беларускія народныя песні:

*«Касіў Ясь канюшыну,*
*Пaглядаў на дзяўчыну.*
*А дзяўчына жыта жала*
*Ды на Яся паглядала»;*

*«Хіба на вечар той можна забыцца?*
*Сонца за борам жар-птушкай садзіцца»;*

*«Зорка Венера ўзышла над зямлёю,*
*Светлыя згадкі з сабой прывяла...»;*

*«Мой родны кут, як ты мне мілы!..*
*Забыць цябе не маю сілы!»;*

*«Ад прадзедаў спакон вякоў*
*Мне засталася спадчына;*
*Паміж сваіх і чужакоў*
*Яна мне ласкай матчынай»;*

*«Саўка ды Грышка ладзілі дуду*
*Павесяліцца ды прагнаць нуду».*

Задача наведвальніка: пераварочваючы грані кубікаў, скласці першыя радкі згаданых літаратурных твораў.

У межах работы выставы музей ажыццявіў інтэрактыўную гульню «Не шукаючы, не знойдзеш», экскурсію «Шлях кнігі да чалавека: з гісторыі кнігадрукавання». Выстаўку наведалі больш за 4100 чалавек. У дадатак да работ, прадугледжаных планам, 19–22 лютага 2021 г. былі ажыццёўлены наступныя мерапрыемствы: праведзена акцыя «Гуляем у словы па-беларуску» на базе сацыяльных сетак музея з мэтай папулярызацыі і захавання моўных традыцый Беларусі. Акцыя выклікала значную цікавасць, у ёй прынялі ўдзел больш за 80 чалавек. Рэалізаваны праект «10 пытанняў пра беларускую мову» (17–26 лютага 2021 г.) на базе сацыяльных сетак музея пры ўдзеле дацэнта, кандыдата філалагічных навук, выкладчыка беларускай мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Л. А. Гедымін. У сацыяльных сетках музея была змешчана абвестка з прапановай задаць сваё пытанне наконт беларускай мовы, яе асаблівасцей, гісторыі. На дзесяць найбольш папулярных сярод атрыманых пытанняў былі падрыхтаваны грунтоўныя адказы. Вынікі апублікаваны на старонцы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь у сацыяльнай сетцы Instagram.

У чэрвені 2021 г. у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь рэалізаваны музейны праект «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры». Праект уяўляў сабой інтэрактыўную экспазіцыю, якая ў даступнай форме прадставіла гісторыю і культуру Беларусі, ён быў ажыццёўлены ў адпаведнасці з грантам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у культуры. У адным з блокаў выстаўкі адлюстраваны тэмы, прысвечаныя адметнасцям самабытнай беларускай культуры, асаблівасцям матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці беларусаў (тэмы: прырода Беларусі, музычная культура, традыцыі і святы, кухня і ежа, традыцыйны касцюм), асобнай экспазіцыйнай часткай прэзентавалася беларуская мова і літаратура. Распрацавана і рэалізавана дзесяць інтэрактыўных комплексаў, разлічаных на аўдыторыю рознага ўзросту, якія ўпісаны ў агульную прастору выставачнага праекта. Інтэрактыўныя комплексы ставілі на мэце прыцягнуць увагу наведвальніка, раскрыць асобныя тэмы, спрыяць большаму «пагружэнню» ў экспазіцыйную і змястоўную прастору, унесці гульнявы элемент у працэс успрымання інфармацыі. У якасці інтэрактыўных элементаў мэтанакіравана былі выбраны не мультымедыйныя сродкі, а звыклыя і простыя для ўспрымання тактыльныя, «фізічныя», пабудаваныя па прынцыпе гульні. Адзін з комплексаў – гульня «Беларускія словы» ўяўляе сабой канструкцыю з карткамі па прынцыпе «перавярні карцінку». З аднаго боку напісаны словы беларускай мовы, з адваротнага – выява са значэннем. Мэта гульні – матывацыя на выкарыстанне беларускай мовы, пашырэнне актыўнага слоўніка. Выкарыстоўваюцца словы, якія сустракаюцца ў экспазіцыі. За час экспанавання (2021 г. – жнівень 2022 г.)

праект наведала больш за 103 000 чалавек), праведзена 350 тэматычных экскурсій.

Філіял Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці таксама рэалізаваў выставачны праект да Міжнароднага дня роднай мовы «Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць» (22 лютага – 21 сакавіка 2022 г.). На працягу гэтага года ў музеі працаваў інтэрактыўны праект – экспазіцыя «Друкарскі двор XVI стагоддзя».

У лютым 2022 г. падрыхтавана выстаўка «Беларуская мова ў перыядычных выданнях першай паловы XX ст.» у межах работы праекта «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры», на якой экспанаваліся аб’екты са збораў музея. На базе сацыяльных сетак музея праведзена акцыя «Гуляем у словы па-беларуску», наведвальнікам прапанавалася прыгадаць любімае слова музейнай тэматыкі.

Акрамя работы на экспазіцыйных плошчах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, супрацоўнікамі вядзецца актыўная работа ў сацыяльных сетках музея па ўзаемадзеянні з наведвальнікамі, зацікаўленай аўдыторыяй па падтрымцы і прасоўванні беларускай мовы. З мэтай яе папулярызацыі падрыхтавана і ажыццёўлена серыя інфармацыйных публікацый, якія суправаджаюцца візуальным кантэнтам, распрацаваны забаўляльна-пазнавальныя тэставыя заданні па асобных тэмах. Кантэнт пададзены на беларускай мове. Аналіз статыстыкі ў сацыяльных сетках сведчыць, што публікацыі, звязаныя з тэмай нацыянальнай культуры, ідэнтычнасці, беларускай мовы набіраюць найбольшую колькасць праглядаў і станоўчых ацэнак, ахопліваюць значна большую аўдыторыю.

Аналізуючы актыўнасць наведвальнікаў на выставачных праектах, запісы ў кнізе водгукаў, нельга не заўважыць цікавасць аўдыторыі да беларускай мовы як аб’екта экспазіцыі і сродку музейнай камунікацыі. Музеі як аўтарытэтныя грамадскія інстытуты вынаходзяць дакладныя сродкі і рэалізоўваюць практыкі, якія будуць спрыяць ужыванню, папулярызацыі беларускай мовы.

Асноўная задача апісаных праектаў, інтэрактыўных сродкаў выкарыстання беларускай мовы ў экспазіцыйнай рабоце – не забаўляць, а праз цікаўнасць натхніць, матываваць на захапленне тэмай, атрыманне дадатковых ведаў, на развіццё пачуцця гонару да роднай мовы, прыцягнуць увагу да важнасці захавання і ўжывання мовы не толькі як літаратурнай, але і як мовы паўсядзённых стасункаў.

Патэнцыял беларускай мовы як праявы нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў музейнай і экспазіцыйнай дзейнасці патрабуе далейшага грунтоўнага вывучэння і аналізу. Апісаныя прыклады станоўчых практык паказваюць, што пры творчым падыходзе да работы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай яе рэсурсы могуць быць выкарыстаны для развіцця праектаў, якія садзейнічаюць захаванню і папулярызацыі беларускай культуры.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

*1.* Белстат: для 61,2 % белорусов родной язык – белорусский [Электронный ресурс] // БЕЛТА. – Режим доступа: https://www.belta.by/society/view/belstat-dlja-612-belorusov-rodnoj-jazyk-belorusskij-406281-2020/. – Дата доступа: 28.09.2022.

*2.* Заседание-совещание с Национальной академией наук Беларуси [Электронный ресурс] // Сайт Президента Республики Беларусь. – Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/ceremoniya-vrucheniya-gospremiy-i-diplomov-akademika-i-chlena-korrespondenta-uchenym-nacio-nalnoy-akademii-nauk/. – Дата доступа: 28.09.2022.

*3.* Итоговые данные переписей населения Республики Беларусь [Электронный ресурс] // Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Режим доступа: https://census.belstat.gov.by/saiku/?guest=true&lang=ru&default_view_state=edit#query/open//public/F503N_ru.saiku. – Дата доступа: 28.09.2022.

*4.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронный ресурс] : 20 ліп. 2016 г., № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. // Pravo.by / Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Мінск, 2016. – 161 с.

*5. Лукашанец, А. А.* Государственные языки / А. А. Лукашанец // Республика Беларусь – 25 лет созидания и свершений : в 7 т. / ред. совет: В. П. Андрейченко [и др.]. – Минск, 2020. – Т. 1 – С. 553–595.

*6. Пань, Юйцинь.* Динамика языковой ситуации в Беларуси и белорусский язык в мире в контексте инициативы «Один пояс и один путь» / Юйцинь Пань, А. А. Лукашанец // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2021. – Т. 66, № 2. – С. 188–199.

УДК 338.483.12(476.6)

**Н. И. Романович,**
*заместитель директора государственного учреждения культуры «Гродненский областной методический центр народного творчества», г. Гродно, Республика Беларусь*

# ПРАКТИКА СОХРАНЕНИЯ И ПОПУЛЯРИЗАЦИИ ТРАДИЦИОННОЙ КУЛЬТУРЫ ГРОДНЕНЩИНЫ КАК ГЛАВНОЕ УСЛОВИЕ РАЗВИТИЯ ПРИВЛЕКАТЕЛЬНОГО ТУРИЗМА В РЕГИОНЕ

**Аннотация.** *Анализируется деятельность учреждений культуры Гродненщины по сохранению и популяризации нематериального культурного наследия. Отмечается, что специалисты учреждений куль-*